Друкуецца ў «Маладосці»



**Вучаніца мінскай гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны ўжо не ўпершыню друкуецца ў «Маладосці». Гэтым разам да паэтычных старонак далучылася эсэ, якое падштурхнула рэдакцыю заклікаць астатніх маладых аўтараў таксама раскрываць таямніцы сваёй творчасці. Адказы на пытанне «Як вы пішаце/ствараеце/натхняецеся/думаеце?» у форме эсэ прымаюцца ў часопіс у рамках праекта «Адваротны бок старонкі», прысвечанага блізкаму 65-годдзю «Маладосці». Вось так занатаваныя думкі школьніцы нараджаюць ідэі для ўсёй краіны. Далучайцеся!**

**Яна НІКІФАРАВА**

# ПАЎНАТЫ ШУКАЙ

*Урывак з эсэ*

Саджуся за пісьмовы стол. Перада мной нататнік з чыстымі лістамі. Прыгажосць, папера ледзь не адбівае сонечныя промні! Асадка — новая, аловак — вастрэйшы за жарты Джорджа Карліна. Здаецца, усё спрыяе нараджэнню геніяльных (ну, хоць бы вартых увагі) радкоў. Але ніводнае слова ў галаву не ідзе. Літаральна ніводнае. Хіба што лаянкавае. Што ж такое? Злосна загортваю нататнік.

Ці так. Зарадка батарэі тэлефона — сто працэнтаў, тэкставая праграма — спампаваная, яркасць дысплея — максімум і беларуская раскладка клавіятуры... Зноў той самы вынік: ніводнага радка, ніводнай рыфмы. Нават дзеяслоўнай.

Ведаю я гэта Натхненне. Яно такое легкадумнае. Прыйдзе, відаць, у самы нязручны момант. Калі буду падразаць на лецішчы галіны бэзу. Ці несціся з хуткасцю променя, каб паспець забраць заказ з багетнай студыі. Ці, найбольш магчыма, у той час, калі ў захапленні буду перагортваць старонкі Рэмарка. Калі ні тэлефона пад рукой, ні нататніка...

Міжволі задумваюся, якія ўмовы для Натхнення самыя прыдатныя? Калі жаданне пісаць апраўдваецца і ператвараецца ў вершы, якія самой не сорамна перачытваць? Памятаю, чытала нейкую Бум-Бам-Літаўскую п'есу, і адзін з яе персанажаў прамовіў наступнае: «Сапраўдная (чытай — вартая) паэзія — пакуты. Нясцерпная горыч». Ці штосьці падобнае, сутнасць дакладна такая. Я тады актыўна паківала галавой, бясслоўна пагадзілася і запомніла гэтыя словы. Ну а што? Сапраўды, уся паэзія, якая чапляе асабіста мяне наймацней, не зззяе вясёлкавай яскравасцю. Я прыхільніца дэкадэнтства, вочы загараюцца пры чытанні Бадлера. У такіх радках адчуваю нерв жыцця, яго пульсаванне, хай сабе і нейкае трывожнае, перадсмяротнае.

*Так, вечна юная, вы будзеце ў магіле!*
*Вам, неўміручая любоў,*
*Пасля таемстваў быць разваліна́й у цвілі*
*І парахнець між чарапоў!*

Вось і мае вершы набываюць цёмнае адценне. Танцоры самазабіваюцца, надрэзаўшы нітку дыска-шара, унутраная прызма змяняе аранжавы колер на шэры, жар пачуццяў абпальвае ўнутраны сад... Бабулі з дзядулямі незадаволена і з сумневам падціскаюць вусны, хлопец сумна ўздыхае. А што зрабіць, калі менавіта ў самоце і разгубленасці прыходзіць падтрымаць Паэзія? У маім выпадку не шапоча пяшчотна штонебудзь накшталт: «Ну, давай, падыміся, усміхніся, усё будзе добра, сонейка ўзыдзе!», а рэзка падхоплівае, крычыць з усяе моцы: «Пад'ём! Бяжы адсюль, уяві сабе самыя непрыемныя і змрочныя вобразы, уключы надрыўны Joy Division і ствара́й, ствара́й! Толькі так ты здолееш, як Мюнхгаўзен, схапіць сябе за валасы і выцягнуць з багны!» І, паверце, я слухаюся. Слухаюся, выхопліваю з кішэні тэлефон (але спачатку насоўку, каб выцерці слёзы) і націскаю, націскаю на дысплей, набіраючы і выдаляючы каштоўныя літары. І ўсё ўжо не здаецца такім безнадзейным...

Тое, што ўва мне

# «Я НЕ БАЧУ СЯБЕ БЕЗ МУЗЫКІ...»

**Ці бывае голас глыбокі, як вір? Безумоўна! І гэта — не прыгожыя словы, паверце. Менавіта такім валодае маладая спявачка з Камянеччыны Жанна ВЯРЭНІЧ...**
**Яе голас «задуманы», літаральна створаны нейкай вышэйшай сілай, што размяркоўвае таленты паміж людзьмі, менавіта — і выключна! — для народнай песні. Той самай, каштоўнасць якой ніхто не аспрэчыць.**
**Пра музыку, нашу спадчыну, паўсядзённае жыццё творчага чалавека і не толькі паразважаем разам з Жаннай. І пачнём, вядома ж, з вытокаў...**



Фота Міколы ШУМА.

* * *

Малая радзіма дзяўчыны — прыгожая вёска Макарава, што ў Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці. Тут яна скончыла пачатковую школу, якой цяпер ужо няма, потым працягвала вучобу ў сярэдняй у Высокім. Любімым прадметам былі — што б вы думалі? — спевы, а яшчэ — родная беларуская мова. Жанна ўдзельнічала ва ўсіх школьных ранішніках і канцэртах, а ў дзясятым класе ўпершыню выйшла на сцэну Макараўскага сельскага Дома культуры. Была таксама і музычная школа па класе акардэона, бо дзяўчыне заўсёды было даспадобы гучанне гэтага інструмента. Жанна таксама спявала ў хоры, але тады яшчэ ў акадэмічнай манеры. Да народнай прыйшла пазней. «Зразумела, што яна сапраўды МАЯ», — тлумачыць дзяўчына.

Калі прыйшоў час вызначыцца з прафесіяй, рабіць выбар было лёгка. Жанна вырашыла не спрачацца са сваім неадольным жаданнем спяваць і з аптымістычнаю думкаю-спадзяваннем «А раптам атрымаецца? А раптам заўважаць?» паступіла ў Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў на спецыяльнасць «Народная творчасць. Харавая музыка» (арганізатар культурнай дзейнасці і вольнага часу, кіраўнік хору). Шкадаваць не давялося. Столькі цікавага было: і заняткі, і канцэрты, і народны хор навучэнцаў «Верас»...

Эстрадныя спевы Жанну не прываблівалі. «Напэўна, таму, што да іх цягнула ўсіх», — тлумачыць яна. Правільнасць выбару пацвердзілася потым падчас праслухоўвання. Студэнты выходзілі па чарзе і спявалі «Купалінку» акапэла. Жанна Вярэніч слухала іншых (у большасці ўладальнікаў сапрана) і вырашыла: выйду ды заспяваю ніжэй. У выніку яе голас аднеслі да альтовых, якому найбольш пасуе народная манера выканання.

Пасля каледжа Жанна трапіла па размеркаванні ў сельскі цэнтр рамёстваў і культуры аграгарадка Каменюкі, дзе два гады працавала мастацкім кіраўніком. Самым запамінальным з праведзеных мерапрыемстваў стала святкаванне Новага года, якому ў месцы, размешчаным побач з Нацыянальным паркам «Белавежская пушча» і сядзібай беларускага Дзеда Мароза, надаецца асаблівае значэнне. Мерапрыемства па матывах «Вечароў на хутары ля Дзіканькі» сабрала поўную залу...

Акрамя таго, у сельскім цэнтры Жанна Вярэніч вяла яшчэ і заняткі гуртка мастацкай самадзейнасці для дарослых і дзяцей. Прычым адна з яе вучаніц нават паступіла ў той жа каледж у Гродне.

Два гады размеркавання праляцелі хутка... Новым месцам работы Жанны стаў шматнацыянальны інтэрнат Брэсцкага дзяржаўнага політэхнічнага ўніверсітэта. З трохсот насельнікаў сотня — іншаземцы з Пакістана, Непала, Бангладэш, Кітая, Туркменістана, Індыі, Бутана і Нігерыі.

Для новай працы спатрэбіліся веды ў галіне педагогікі. Таму Жанна завочна скончыла педуніверсітэт імя Максіма Танка ў Мінску. Сёння ў абавязкі дзяўчыны ўваходзяць арганізацыя культурных мерапрыемстваў для студэнтаў і дапамога ў наладжванні ўзаемаадносін.

У інтэрнацыянальным асяроддзі Жанне працуецца цікава: «Спасцігаю культуру розных народаў і не стамляюся здзіўляцца». Дзяўчына ўдзельнічала, напрыклад, у святкаванні кітайскага Новага года, а таксама Курбан-байрама, напярэдадні якога студэнты-туркмены набылі недзе барана, а потым гатавалі плоў, якім частавалі ўсіх, — такая традыцыя.

* * *

Сёння ў рэпертуары Жанны Вярэніч як спявачкі — беларускія, рускія і ўкраінскія песні. Ёй бясконца імпануе фальклор, бо ён — аснова, крыніца, гісторыя, традыцыі. «У народнай песні, у адрозненне ад іншых (не ўсіх, натуральна), ЗАЎСЁДЫ ёсць сэнс», — гаворыць дзяўчына.

Кожны новы твор спявачка абавязкова падстройвае пад сябе. Увогуле, заўсёды стараецца спяваць па-свойму, прапусціць праз душу і сэрца, пражыць песню. Калі ж гаварыць пра выступленні, то, падбіраючы да іх рэпертуар, Жанна ўлічвае і месца будучага канцэрта, і тэматыку яго, і слухача, і нават час сутак: спяваць днём у парку і вечарам там жа адно і тое ж — немагчыма.

На пытанне аб выканаўцу, які ўразіў найбольш і ў якога хочацца вучыцца, Жанна адказвае адназначна і без роздумаў: «Пелагея!» І дадае: «Калі б мая запаветная мара здзейснілася, я трапіла б на праект «Голас» і да мяне павярнуліся б усе суддзі, выбрала б у настаўнікі толькі яе».

З беларускіх калектываў народнай накіраванасці Жанна аддае перавагу «Бяседзе». А калі казаць пра наш бясцэнны фальклор і яго захаванне, дзяўчына выдзяляе праект тэлеканала «Беларусь 3» «Наперад у мінулае». З яго можна пачарпнуць столькі цікавага: і спеваку, і аматару народнага ў цэлым. Часам удаецца прыкмеціць нейкую песню і ўзяць яе «мінусоўку».

Жанна Вярэніч ахвотна выступае — заўсёды ўжывую! — на самых розных сцэнах: у Каменцы і Высокім, на розных пляцоўках Брэста. Прычым абласны цэнтр у свой час падарыў ёй магчымасць удзельнічаць у канцэрце брэсцкага ансамбля танца «Радасць» на сцэне Брэсцкага абласнога акадэмічнага тэатра драмы імя Ленінскага камсамола Беларусі.

Перад выхадам на сцэну заўсёды просіць Божае падтрымкі і настройваецца на народную песню, якая «прадугледжвае стрыманасць і акуратнасць у абыходжанні».

«Спяваць не так лёгка, як можа здавацца, — дадае Жанна. — Самы дарагі, шыкоўны музычны інструмент без рук музыкі не народзіць ні гуку. Так і голас не існуе без спевака і яго працы».

Цікаўлюся, ці ўдзельнічае Жанна Вярэніч у якіх-небудзь конкурсах ды фестывалях. Адказам мне становіцца сумнае: «Не так часта. Павінна адзначыць, што ў нашай краіне, на жаль, для выканаўцаў народнай песні іх не так і шмат». Сярод самых значных дасягненняў спявачкі — удзел у фестывалях нацыянальных культур у Гродне і «Ружанскай браме», рэспубліканскім конкурсе ў складзе каманды Гродзенскай вобласці, а таксама дыплом трэцяй ступені рэспубліканскага конкурсу «Зорка ўзышла над Беларуссю».

«Увогуле кастынгі не люблю, — даверліва расказвае Жанна. — Да таго ж часта бачу, як людзі з выдатнымі галасамі выбываюць з іх «з-за адсутнасці харызмы». Гэта дзіўна...»

Але аднойчы спявачка ўсё ж рашылася на адну авантуру... У 2015-м таемна ад усіх паехала ў Брэст на кастынг, які арганізоўваў пераможца «Еўрабачання» Аляксандр Рыбак. Ён напісаў песню для гэтага конкурсу і шукаў для яе выканаўцу, прычым менавіта з народным голасам.

Жанна выканала тады дзве песні. Аляксандр зрэагаваў вельмі станоўча, пахваліў. Дзяўчыне аб'явілі, што першы тур яна прайшла, і абяцалі патэлефанаваць. З другім, на жаль, не склалася, але спявачка не шкадуе, што паспрабавала свае сілы...

На апошняе маё пытанне — «Што для цябе музыка?» — Жанна Вярэніч адказала: «Не люблю гучных слоў, таму няхай будзе так: без яе я сябе не бачу».

**Настасся НАРЭЙКА.**

Увага, конкурс!

# ФОРМУЛА ПОСПЕХУ,

## ці Вядомыя і пачаткоўцы пад адной вокладкай

**Зборнік апавяданняў пра Мінск вядомых аўтараў і тых, хто толькі пачынае пісаць, выйдзе па выніках літаратурнага конкурсу. Работы на яго прымаюцца да 1 сакавіка.**

Мэта гэтага адмысловага спаборніцтва — заахвочванне і падтрымка літаратурнай творчасці маладых людзей, папулярызацыя чытання, нацыянальнай мовы і культуры. Ідэя «10 + 10» належыць арганізатарам фестывалю «Горад і кнігі», які сёлета пройдзе 18—19 мая ў Мінску трэці раз. «Горад і кнігі» — праект, арганізаваны валанцёрамі. За ўвесь час у яго рамках адбылося больш за 300 кніжных і літаратурных мерапрыемстваў, якія наведалі звыш 16 тысяч чалавек. Конкурс «10 + 10» праводзіцца сумесна з часопісам «Маладосць». Пасля яго заканчэння ў адным выданні будуць сабраныя кароткія творы пра беларускую сталіцу 10 вядомых аўтараў і 10 аўтараў-пачаткоўцаў.

На конкурс прымаюцца творы прозы на беларускай мове, якія раней нідзе не былі апублікаваныя. Удзельнікам можа стаць любы грамадзянін краіны ва ўзросце 18—30 гадоў. Найлепшыя работы будуць выбраныя прафесійным журы, у склад якога ўвойдуць арганізатары конкурсу. Больш падрабязна з яго ўмовамі можна азнаёміцца на сайце фестывалю «Горад і кнігі». Частку тыражу зборніка плануецца перадаць у бібліятэкі краіны. Апавяданні пераможцаў таксама будуць надрукаваныя ў часопісе «Маладосць». Творы прафесійных аўтараў апублікуюць на старонках выданняў — партнёраў праекта — да выхаду зборніка, прэзентацыя якога адбудзецца на фестывалі «Горад і кнігі».